# «Краіну трэба захаваць, і мы павінны мабілізавацца»

*(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што адказнасць за здарэнне з самалётам Яўгена Прыгожына цяпер многія спрабуюць павесіць на Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна. Але, паводле слоў кіраўніка дзяржавы, яго расійскі калега тут абсалютна ні пры чым.

«Я не магу сказаць, хто гэта зрабіў. Я не стану адвакатам нават свайго старэйшага брата, але я ведаю Пуціна. Гэта ашчадны, вельмі спакойны і нават марудлівы чалавек, калі прымае рашэнне па іншых, нават менш складаных пытаннях. Таму я не магу ўявіць, што гэта зрабіў Пуцін і што вось вінаваты Пуцін. Слухайце, занадта грубая, непрафесійная работа, калі ўжо на тое пайшло. Гэта не падобна да Пуціна. Але, што б там ні здарылася, гэта зваляць на Пуціна», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы заўважыў: калі здараецца «гадасць», — што ў Беларусі, што ў Расіі, — вінаватымі робяць прэзідэнтаў. Гэтак жа і гэты раз. «Гэта грубая, агідная, ненармальная работа. Я далёкі ад таго, каб думаць, што гэта зрабіў Пуцін, што камусьці ён даручыў, што ўлада гэта зрабіла», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Ён распавёў, што падтрымліваецца кантакт з сям'ёй Яўгена Прыгожына і яны перакананыя, што ён загінуў.

«Я нічога не абвяргаю. Я не ведаю. Я на месцы крушэння самалёта не быў. Адзінае — я пачынаю думаць: ракета збіла, выбух на борце... Вы ведаеце, што такое збіла ракета? Гэта ж толькі галоўнакамандуючы можа даць каманду нешта зрабіць. Далей дадуць каманду нейкаму канкрэтнаму падраздзяленню. А той дасць каманду разліку канкрэтнаму. Разумееце, колькі людзей задзейнічана? Які ідыёт гэта будзе рабіць? Хоць я і гэтага не адмаўляю: чорт яго ведае, можа, нейкія там вар'яты вырашылі гэта. Але не веру», — сказаў Прэзідэнт. Ён адзначыў, што дакладна вядома, што ў самалёта адарваўся хвост, значыць, хутчэй за ўсё, быў выбух на борце. «Хто гэта здзейсніў, асабіста не ведаю. Але я сказаў, што я, ведаючы Пуціна, наколькі ён педантычны, асцярожны, акуратны, не веру, што ён будзе гэтым займацца. І потым. Для кіраўніка дзяржавы такога гэта вар'яцтва. Ён не вар'ят. Я далёкі ад таго, каб яго рабіць белым і пухнатым. У нас праца такая, «брыдкая». Я не раблю яго белым і пухнатым, але ведаю, што ўсё будзе звалена на яго. Так яно і атрымліваецца. Захад пачаў гарлапаніць, падпяваць яму пачалі іншыя, што «вось, Пуцін, шкодны і злапамятны». Як бы ні было, што б ні адбывалася, час пакажа. Пройдзе час, мы ўсё даведаемся. Гэта схаваць у сучасны час немагчыма. Але тое, што адбылося, агідна. Для мяне гэта непрымальна». Для сапраўднага кіраўніка дзяржавы гэта непрымальна яшчэ і з такога пункту гледжання: «Усе мы мужыкі, вайна ёсць вайна, але ў чым вінаватыя трое пілотаў, сцюардэса? Так ма палова людзей, якая ўвогуле да гэтага «маршу справядлівасці» не мела дачынення. Таму я гэтага не разумею і не прымаю. Гэта недапушчальна», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт таксама адзначыў, што ў замаху на Яўгена Прыгожына для расійскіх улад не было ніякага сэнсу: сітуацыя з ПВК «Вагнер» устаканілася, бакі прыйшлі да дамоўленасцяў і ўзгаднілі далейшыя крокі.

Пракаментаваў Аляксандр Лукашэнка і меркаванні аб тым, што ён павінен быў даць гарантыі бяспекі Яўгену Прыгожыну. Па яго словах, такіх размоў ніколі не было. Прэзідэнт адзначыў, што ў час перагавораў з Яўгенам Прыгожыным абмяркоўвалася два пытанні: спыненне крымінальных спраў адносна вагнераўцаў і іх вывад у Беларусь. «Гэта я прапанаваў. Кажу: «Калі вы чагосьці баіцеся, я буду размаўляць з Прэзідэнтам Пуціным, мы вас выведзем у Беларусь. Мы вам гарантуем у Беларусі поўную бяспеку». І, трэба аддаць належнае, Жэня Прыгожын ніколі не прасіў мяне асобна ўдзяліць увагу пытанням бяспекі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Ён таксама прывёў яшчэ адзін прыклад. У час зімовага візіту Аляксандра Лукашэнкі ў Аб'яднаныя Арабскія Эміраты яму паступіла інфармацыя аб тым, што на Яўгена Прыгожына рыхтуецца замах. «На працягу дзвюх гадзін (я даручыў) знайшлі пасла Расіі ў Эміратах, выклікалі яго да мяне. Я перадаў яму шыфраграму ў Крэмль Пуціну і Бортнікаву аб замаху на Прыгожына», — падзяліўся інсайдамі беларускі лідар. Праз некаторы час Аляксандр Лукашэнка ўдакладніў у Яўгена Прыгожына, ці дайшла да яго гэтая інфармацыя. Заснавальнік ПВК «Вагнер» пацвердзіў, што Прэзідэнт Пуцін папярэдзіў яго пра замах, які рыхтуецца.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што спакойна рэагуе на заўвагі аб тым, што ён нібыта не забяспечыў абяцаныя Яўгену Прыгожыну гарантыі бяспекі. «Трэба ж нешта пісаць. Каб мяне недзе ўкалоць і гэтак далей. Не больш за тое. Гэта ж недарэчна. Учора сказалі — палова тых, хто прачытаў адразу, пасмяялася. А астатняя палова праз дзень падумала: «Пры чым тут Лукашэнка? Як ён мог у Афрыцы (а Прыгожын ляцеў з Афрыкі) забяспечыць яму бяспеку? А потым ён прызямліўся ў Маскве і паляцеў у Піцер. Як я мог яму гарантаваць гэтую бяспеку? Таму гэтыя пытанні не да мяне. Тым больш такой размовы ніколі не было — гарантаваць бяспеку на чужой тэрыторыі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

## «Вагнер жывы і будзе жыць»

Ён звярнуў увагу, што на сваёй тэрыторыі беларускі бок выканаў усе абяцанні, дадзеныя ўдзельнікам ПВК «Вагнер», і нават больш за тое. І ўдзельнікі ПВК «Вагнер», якія знаходзяцца ў Беларусі, ніякіх прэтэнзій не маюць». Учора старшыня КДБ звязаўся з імі па маім даручэнні, і ад мяне перадалі ім толькі адзін мэсэндж: усё, пра што мы з Прыгожыным дамаўляліся, выканаем. Таму «Вагнер» жывы, «Вагнер» жыў і будзе жыць на тэрыторыі Беларусі, як бы каму гэтага ні хацелася. Мы яшчэ з Прыгожыным выбудавалі сістэму, як у нас будзе размяшчацца «Вагнер», — расказаў Прэзідэнт.

Журналісты звярнулі ўвагу, што цяпер адна з хваляў фэйкаў — здымкі са спадарожніка, як у лагерах «Вагнера» ў Беларусі прыбіраюць палаткі, значыць, яны кудысьці збіраюцца. «Калі ўжо вельмі шчыра. Тут застаецца ядро. Хтосьці з'ехаў у водпуск, хтосьці наогул вырашыў жыць убаку. Але тэлефоны, адрасы, паролі, яўкі ў гэтым штабе, у гэтым ядры вядомыя. Цягам некалькіх дзён усе будуць тут, да 10 тысяч чалавек. Цяпер няма неабходнасці іх трымаць. Яны будуць сюды прыязджаць пэўнымі партыямі на падрыхтоўку. Але калі Расія захоча адсюль браць людзей на ратацыю — нікуды не дзенешся, павінна быць ратацыя», — сказаў Прэзідэнт. Ён таксама адзначыў, што вагнераўцы за ўсё плацяць беларусам.

«І пры тым, запомніце, жывуць яны ў палатках, і казарму мы рамантуем. Гэта было маё патрабаванне. Яны ў палатках не збіраліся жыць. Яны заўсёды жылі, жывуць і будуць жыць у зямлянках. Мы сказалі: «хлопцы, мы дапаможам выкапаць, калі хочаце, але навошта? Можна цывілізавана жыць». І яны пагадзіліся», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт таксама адказаў на пытанне, ці не баіцца ўлады трымаць у краіне такіх падрыхтаваных у ваенным плане байцоў. «А навошта нам іншыя? Я не сяджу на парахавой бочцы. Шчыра вам гавару: няма такога настрою ні ў каго», — адказаў кіраўнік дзяржавы. Ён заўважыў, што беларускія вайскоўцы з задавальненнем пераймаюць вопыт у вагнераўцаў, асабліва ўнутраныя войскі і спецыяльныя падраздзяленні. Адпрэчвання ніякага няма, што, паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, яго здзівіла.

«Я баяўся (чытаў жа вашы і вашых калег пісанні): гэта арыштанты, гэта такія, гэта сякія. Слухайце, праз дарогу бабулю пераводзяць, у краме рэшту не бяруць. Дзіўныя людзі. Жалезная дысцыпліна. Ваўкоў баяцца — у лес не хадзіць. Мы ж іх трымаем не дзеля задавальнення тут, а дзеля карысці. І сістэму ж выбудавалі так, каб усё было пад кантролем», — падкрэсліў ён.

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што ніякай небяспекі ад знаходжання вагнераўцаў у Беларусі няма. Паводле яго слоў, неабходна выстройваць з імі чалавечыя адносіны. «Як я аднойчы сказаў, калі спарадзілі такое падраздзяленне, то і стаўцеся да іх па-чалавечы, размаўляйце, тлумачце, удакладняйце, чаго ім бракуе на фронце — боепрыпасаў, ежы ці адзежы. Усе людзі. А тым больш тыя, хто гэта рабіць папраўку на тое, што яны ваююць, яны кожны дзень рызыкуюць сваім жыццём. Таму я пакуль не бачу гэтых праблем. І сістэму мы выбудавалі так, каб усё было пад кантролем», — сказаў ён.

Прэзідэнт развянчаў фэйк аб прылёце ў Беларусь расійскага ваенна-транспартнага борта пасля здарэння з самалётам Яўгена Прыгожына. Такі запыт, расказаў Прэзідэнт, сапраўды быў, але пакуль у Беларусь ніхто не прылятаў.

«Вагнераўцы (тое, што з Расіяй было ўзгоднена, дакладна) папрасілі ў нас пралёт на нашы аэрадромы, каб забраць для ратацыі байцоў, я думаю, у Афрыку, і нейкае абмундзіраванне, абсталяванне і гэтак далей. Калі ласка, сядайце, забірайце. Гэта мною было абяцана, гарантавана. Гэта першае. Другое — ніякіх самалётаў не было. Таму хлусня. Але запыт такі быў. Прышоў ён нам 21-га чысла», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

## «Мы адпрацоўваем звычайныя пытанні»

Адказваючы на пытанне, ці варта Захаду расцэньваць як сігнал вучэнні АДКБ, якія 1 верасня пачынаюцца ў Беларусі, Аляксандр Лукашэнка параіў Захаду не перажываць. «Я, шчыра кажучы, нават у дэталі не ўнікаў гэтых вучэнняў. Але ў цяперашняй сітуацыі, каб не нагнятаць абстаноўку і сітуацыю, — там няма такога баявога складніка. Там будуць невялікія падраздзяленні некаторых краін АДКБ, якія будуць адпрацоўваць у асноўным штабныя пытанні, тактыку і стратэгію на будучыню. Таму ўсе яны ведаюць, мы ж іх загадзя папярэдзілі», — сказаў Прэзідэнт. Але ён папярэдзіў, што на Захадзе адпаведную тэматыку будуць выкарыстоўваць і сцвярджаць, што Беларусь і Расія нешта задумалі і рыхтуюць наступленне на тую ж Польшчу. «Нічога падобнага. Ніякага наступлення. Мы адпрацоўваем звычайныя пытанні, якія былі даўно сплынаваны. Таму і вам, і ім перажываць за гэта не трэба», — запэўніў беларускі лідар.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Актуальна

# НАВУЧАННЕ І ВЫХАВАННЕ — З УЛІКАМ СУЧАСНЫХ РЭАЛІЙ

## У Мінску адбыўся гарадскі педагагічны форум «Адукацыя сталіцы: новыя рэаліі і новыя магчымасці»

**Кіраўнікі дзяржаўных і грамадскіх арганізацый Мінска, адміністрацый раёнаў сталіцы і іх намеснікі, начальнікі ўпраўленняў па адукацыі адміністрацый, кіраўнікі ўстаноў адукацыі і прадстаўнікі галіновага прафсаюза абмеркавалі актуальныя пытанні, якія сёння стаяць перад сферай адукацыі, вызначылі напрамкі далейшага развіцця.**



Фота БелТА.

Павышэнне якасці і выніковасці адукацыі, акцэнт на грамадзянска-патрыятычным выхаванні, дэструктыўныя праяўленні ў жыцці падлеткаў, бяспека дзяцей — гэта яшчэ не ўсе пытанні, на якія была скіравана ўвага ўдзельнікаў форуму.

— Стала традыцыйным напярэдадні 1 верасня, свята ведаў, якое праводзіцца ў нашай краіне, праводзіць такія форумы, — звярнула ўвагу **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА.** — Тады, калі падводзяцца вынікі папярэдняга навучальнага года, вынікі ўступнай кампаніі, тады, калі ставяцца задачы, якія неабходна вырашаць педагагічнай супольнасці ў будучым навучальным годзе. Адукацыя горада Мінска мае ўсе магчымасці зрабіць так, каб гэтая адукацыя была перадавой. Навацыі вы можаце распрацаваць з улікам таго патэнцыялу, які ёсць.

«Адукацыя — гэта прыярытэтны кірунак сацыяльнай палітыкі нашай дзяржавы», — падкрэсліла Наталля Качанава. Спікер верхняй палаты парламента заўважыла, што перад педагагічнай супольнасцю стаіць нямала задач. І гэта не толькі навучанне дзяцей. Па яе словах, важна ўдзяліць належную ўвагу і выхаванню будучых пакаленняў: у першую чаргу, выхоўваць іх згодна з традыцыйнымі каштоўнасцямі.

— Усе ўстановы адукацыі да пачатку навучальнага года павінны быць у поўнай гатоўнасці, — паставіў задачу **міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ.** — Цяпер працуюць маніторынгавыя групы. Адзначаем, што ёсць шэраг сістэмных недахопаў, над якімі мы аператыўна працуем, таму што да 1 верасня, па даручэнні кіраўніка дзяржавы, усю гэту работу неабходна завяршыць.

Па меркаванні кіраўніка ведамства, сёння педагогам неабходна звярнуць увагу не толькі на пытанне адукацыйнага працэсу, але і на выхаваўчую работу. «Асабліва на работу з дзецьмі, якія маюць патрэбу ў абароне, — канкрэтызаваў ён. — Размова ідзе аб дзецях, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, дзецях-сіротах і іх забяспячэнні. Гэта асаблівая катэгорыя дзяцей, якія маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне. Яшчэ адзін немалаважны аспект — работа з дзецьмі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Хацеў бы сказаць, што з боку педагагічнай супольнасці і ў цэлым з боку сістэмы адукацыі робіцца ўсё для стварэння неабходнай адукацыйнай прасторы, каб кожнае дзіця магло атрымаць адукацыю ў даступным і камфортным для яго асяроддзі».

Як адзначыў **старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ,** адукацыя павінна развівацца і адпавядаць духу часу. «У нашай адукацыі вельмі добрыя традыцыі, — удакладніў ён. — Вельмі шмат выдатных педагогаў, якія даюць добрыя, моцныя веды. Створана сістэма адукацыі на ўсіх узроўнях. І, вядома, нам трэба працаваць над тым, каб, па-першае, захаваць такую сістэму адукацыі, па-другое, каб яе дашліфоўваць. Мы павінны чэрпаць інфармацыю менавіта знутры, са школ, яе аналізаваць і ўстараняць усе праблемныя пытанні. Галоўнае, каб сістэма адукацыі была для кожнага школьніка камфортнай. Задача — не толькі навучыць, але і стварыць для вучня магчымасці, каб ён імкнуўся вучыцца. І школа для гэтага ўсё робіць».

**Вераніка КАНЮТА.**

*Больш падрабязна аб тым, што абмяркоўвалася на форуме, — у найбліжэйшым выпуску «Мясцовага самакіравання».*